МГПУ им. И.П.Шамякина

**Л.А. Лісоўскі, Т.С. Кісялевіч**
**(**Мазыр, Мазырскі дзяржаўны педагагічныўніверсітэт імя І.П. Шамякіна)

## ВЫВУЧЭННЕ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА ЯК КРАЯЗНАЎЧЫ КАМПАНЕНТ ПРАДМЕТА "ЧАЛАВЕК І СВЕТ" У ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Прадмет "Чалавек і свет" з'яўляецца адным з галоўных накірункаў адукацыйнага працэсу па вывучэнні малой Радзімы. У вучняў з першага класа фарміруюцца паняцці і ўяўленні аб краіне, у якой яны пражываюць, аб яе назвах, аб прыгажосці і непаўторнасці прыроды свайго куточка Зямлі.

У чацвёртым класе часткай кампанента “Чалавек і грамадства” з’яўляецца блок “Мая Радзіма – Беларусь”, у якім фарміруюцца паняцці “Радзіма”, “бацькаўшчына”. Асноўная функцыя вучэбнага прадмета “Чалавек і свет” – навучыць школьніка здабываць веды, неабходныя для беражлівых адносін да прыроды, а таксама для ўдумлівых адносін да навакольнага асяроддзя [1].

Вывучэнне роднага краю – першы крок на шляху навуковых даследаванняў малодшых школьнікаў. Краязнаўства садзейнічае развіццю самастойнасці школьніка, дапамагае пазнаваць культурную і гаспадарчую дзейнасць чалавека, удзельнічаць у ахове і ўзнаўленні багаццяў роднага краю. На аснове сабраных матэрыялаў ствараецца краязнаўчы вугалок або музей. У ім змяшчаюцца звесткі аб прыродзе, насельніцтве і гаспадарцы. Заняткі ў краязнаўчых гуртках, правядзенне экскурсій, паходаў, збор матэрыялаў дазваляе стварыць геаграфічнае і гісторыка-краязнаўчае апісанне пэўнай мясцовасці [2].

Намі сабраны некаторы краязнаўчы матэрыял аб сельскіх населеных пунктах Лельчыцкага раёна, які выкарыстоўваецца на занятках па прадмеце “Чалавек і свет”, “Літаратурнае чытанне” і іншых, а таксама на занятках пазакласнай і пазашкольнай работы.

**Альховая**, вёска ў Грабянёўскім сельсавеце, у складзе камунальнага сельскагаспадарчага прадпраемства “Грабяні”. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XX ст. як хутар Буйнавіцкай воласці Мазырскага павета. Паводле перапісу 1917 г. знаходзіліся 2 хутары: Альховая-Старая і Альховая-Новая. Пазней хутары былі аб’яднаны ў вёску. У чэрвені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску, загубілі 7 жыхароў. У наваколлі вёскі дзейнічалі партызаны Лельчыцкай партызанскай брыгады.

**Астражанка**, вёска, цэнтр сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства “Астражанка”. Упершыню ўпамінаецца ў 1609 г. як сяло. У канцы XIX ст. праваслаўны прыход налічваў 444 душы мужчынскага і 470 душ жаночага полу. На пачатку 1930-х гг. У вёсцы калгас “Чырвоная зорка”, паравы млын, кузня. У 1942 годзе нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску і загубілі 71 жыхара. Радзіма беларускага пісьменніка М.Ф. Капловіча. Маецца брацкая магіла савецкіх воінаў і помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**Асянскоое,** вёска Бароўскага сельсавета. Вядома, як хутар Лельчыцкай воласці Мазырскага павета. У 1917 г. – хутар, 29 двароў, 189 жыхароў. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску і загубілі 25 жыхароў. Каля вёскі помнік археалогіі, які адносіцца да ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі. На могілках брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.

**Буда-Сафіеўка**, вёска Буйнавіцкага сельсавета. У 1917 г. пражывала 473 жыхары, у 1930-х гг. створаны быў калгас “Парыжская камуна”. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі вёску і загубілі 25 жыхароў. Маецца брацкая магіла савецкіх воінаў і ў цэнтры вёскі помнік землякам, якія загінулі у Вялікую Айчынную вайну.

**Буйнавічы**, вёска, цэнтр сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства “Буйнавічы”. Вядома па пісьмовых крыніцах з 1551 г. як сяло ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 58 жыхароў. У наваколлі вёскі дзеёнічалі партызаны Лельчыцкай брыгады Палескай вобласці і ўкраінскага злучэння С.А. Каўпака. Брацкая магіла савецкіх воінаў каля школы-інтэрната і на могілках вёскі.

**Букча**, вёска, цэнтр сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства “Прыбалавічы”. Вядома па пісьмовых крыніцах XVI ст. як сяло ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Паводле перапісу 1917 г. – 913 жыхароў, у тым ліку 762 беларусы і 151 яўрэй. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 73 жыхары. У наваколлі вёскі дзейнічалі партызаны Лельчыцкай брыгады Палескай вобласці і ўкраінскага злучэння С.А. Каўпака. Брацкая магіла партызан.

**Ветвіца**, вёска Ударнянскага сельсавета. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 4 жыхароў. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.

**Восаў**, вёска Сіманіцкага сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпраемства “Сіманічы”. У пачатку XX ст. вядома як хутар. У красавіку 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 2 жыхароў. Недалёка ад вёскі маецца помнік археалогіі. Курганны магільнік з 38 курганоў, вышынёй 2,5 м, дыяметрам 15 м. Абследаваў у 1976 г. П.Ф. Лысенка.

МГПУ им. И.П. Шамякина

**Вусаў**, вёска Грабянёўскага сельсавета. Вядома з пачатку XX ст. як хутар Буйнавіцкай воласці Мазырскага павета. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 6 жыхароў. Адселена ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.

**Глушкавічы**, вёска ўспамінаецца ў архіўных дакументах, у вопісе Оўруцкага замка за 1545 год. Цэнтр сельсавета і камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "Перамога". У 1815 г. было 2 млыны, царква, карчма, дзейнічала суконная вытворчасць і па вырабе мукамольных камянёў. У 1917 г. – 1688 жыхароў (1559 беларусаў, 129 яўрэяў). 26–27 снежня 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 300 жыхароў. У ваколіцах вёскі дзейнічалі партызаны Лельчыцкай брыгады, славацкага атрада на чале з Янам Налепкам, украінскіх злучэнняў С.А. Каўпака, А.М. Сабурава, А.Ф. Фёдарава. Брацкая магіла партызан. Магіла ахвяр фашызму.

**Грабяні**, вёска, цэнтр сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "Грабяні". Вядома з 1881 г. як хутар. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 5 жыхароў. Помнік археалогіі ва урочышчы Струбачы, 7 насыпаў дыяметрам 7–8 м. Абследаваў у 1976 г. П.Ф. Лысенка.

**Данілевічы (Данілегі)**, вёска у складзе камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "Новая Ніва". Упершыню упамінаецца ў 1508 г. У 1917 г. – 587 жыхароў. У снежні 1942 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі ўсю вёску і загубілі 8 жыхароў. У ваколіцах дзейнічаў славацкі партызанскі атрад пад камандаваннем Яна Налепкі. З 2000 года дзейнічае Свята-Міхайлаўская царква. Каля вёскі ў лесе знаходзіцца Цар-дуб вышынёй 32 м, дыяметрам 1,6 м, акружнасцю 4,5 м – помнік прыроды рэспубліканскага значэння.

**Дзяржынск (да 1925 г. Радзівілавічы)**, вёска, цэнтр сельсавета камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "На варце". Упершыню ўпамінаецца ў 1520 г. як сяло, якое належала гетману Вялікага Княства Літоўскага К.І. Астрожскаму. У чэрвені 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і знішчылі 13 жыхароў. У наваколлі вёскі дзейнічалі партызаны Лельчыцкай брыгады Палескай вобласці і ўкраінскага злучэння Сабурава, якое 5 студзеня 1943 г. разграмілі нямецка-фашысцкі карны атрад. На месцы бою пастаўлены абеліск [3].

Сабраны краязнаўчы матэрыял мае асаблівае значэнне пры вывучэнні прадмета "Мая Радзіма – Беларусь" у 4 класе. Вучні ў час вывучэння тэмы "Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны" рыхтуюць кароткія паведамленні аб зверствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў і гераізме мірных жыхароў, партызан і савецкіх воінаў.

Такім чынам, краязнаўчая работа па прадмеце "Чалавек і свет" дапамагае вывучэнню роднага краю і патрыятычнаму выхаванню асобы школьніка.

**Літаратура**

1. Мая Радзіма – Беларусь, 4 класс. Мінск, Выдавецкі цэнтр БДУ, 2013. – 151 с.
2. Лисовский, Л.А. Краеведение географическое // Л.А. Лисовский Белорусская педагогическая энциклопедия в 2-х томах / Белорус. пед. энцикл.; редкол.: Н.П. Баранова [и др.]. – Минск: «Адукацыя і выхаванне», 2015. – Т. 1. – С. 286.
3. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Лельчыцкага раёна. – Мінск: П 15 "Паліграфафармленне", 2002. – С. 575–588.

МГПУ им. И.П. Шамякина